**Тэма нумару** # Гарадніччанка: сучасны стан хроснай маці Горадні

**Горадню рэканструіруюць: дзе можна і дзе няможна.**

стар. 4-5

першая экалагічная газета

# Pro Nobis*

распаўсюджваецца бясплатна №4(8) ЛЕТА 2006

## Калі ж саджаць?

**Некаторыя дрэвы, што пасадзіў "Зелянстрой" гэтай зімою па праспекце Я. Купалы, улетку пазасыхалі: хто не прыняўся, а хто не вытрымаў ліпеньскай спякоты.**

Усяго было пасаджана каля 30 дрэўцаў. Найбольш пакутуюць сосны – 3 засохлыя з 5 пасаджаных прыбралі яшчэ на пачатку лета – не прыняліся. Ліставыя пакуль стаяць, але некаторыя бярозкі ўжо зусім зжаўцелі.

Пасадкі каля дома № 72 па праспекце Янкі Купалы рабіліся ў межах добраўпарадкавання і азелянення горада ў лютым-сакавіку гэтага года. Па меркаваннях спецыялістаў, якія мы прыводзілі ў вясновым нумары, 6-8 гадовыя саджанцы павінны былі прыняцца, бо пасадку дрэваў такога ўзросту ажыццяўляюць якраз узімку.

Ці саджалі не так, як трэба – без душы, ці такая працяглая спякота не па сілах нават дрэвам.

В.С.




## Сквер на плошчы павінен быў застацца

**Маладыя, кволыя дрэўцы былі высаджаны на пачатку ліпеня на абноўленай Савецкай плошчы замест старых дрэваў сквера, нягледзячы на тое, што знішчэнне сквера не прадугледжвалася.**

У самую спякоту – пры 30°C – 7 ліпеня каля 50 саджанцаў пяцігадовых бяроз, клёнаў і туяў, прывезеных з Польшчы, размясцілі на месцы былога сквера паміж вуліцамі Стэфана Баторыя і Маставой. Так падыйшла да свайго завяршэння перабудова Савецкай (колішняй Рынкавай) плошчы. У выніку "рэканструкцыі" там не засталося ні воднага старога дрэва. Па словах архітэктара праекта азелянення плошчы Аляксандра Захарчука, прадугледжвалася максімальнае зберажэнне былых пасадак. Супрацоўнікамі Гроднаграмадзянпраекта было праведзена абследванне сквера на наяўнасць хворых і пашкоджаных дрэў. Ураган у мінулым годзе прыўнёс свае карэктывы, але агулам трэба было прыбраць толькі каля 70 раслінаў.

"Актаў аб вырубцы ўсіх дрэваў я не падпісваў. Гэта ініцыятыва зверху," – кажа А. Захарчук.

Па звестках супрацоўніка вытворчага аддзела "Зелянстрою", знішчэнне старых дрэваў было абумоўлена эканоміяй матэрыяльных сродкаў.

"Як Вы зробіце рамонт у сябе ў хаце, калі не прыбярэце ўсё непатрэбнае? Канешне, можна было захаваць сквер, але навошта, калі проста вырубіць дрэвы нашмат танней.

Працяг на стар. 2

*Pro Nobis (c) - lat. Для Нас



Вось так выглядае новы «сквер»

І што ж такога цэннага Вы бачыце ў гэтых дрэвах?" – шчыра дзівіўся супрацоўнік "Зелянстрою".

Ён растлумачыў і прычыну, па якой не былі выкарыстаны больш сталыя дрэвы: апошнія можна саджаць толькі зімой, разам з камяком глебы, які ўлетку не трымаецца. Па яго словах, на плошчы запланавана высадзіць агулам каля 300 дрэўцаў.

Як мінімум, яшчэ дваццаць гадоў у гарадзенцаў не будзе ўтульнага цяністага сквера.

Былы ж уваходзіў у агульную сістэму зялёных прысадаў горада і быў адным з трох самых значных яго сквераў, разам з пасадкамі на вуліцы Замкавай і каля бібліятэкі імя Карскага. Усе яны былі закладзены ў 1950-х гадах.

Раней наш горад называлі адным з самых зялёных у краіне. Па меркаваннях гісторыкаў і краязнаўцаў, калі яго і далей будуць "рэканструяваць" такім чынам, ён страціць сваю адметнасць і стане проста шараговым бетонным населеным пунктам. А гэта ж старажытная Горадня, шмат для каго – найпрыгажэйшы куток свету.

**Вольга Сташко**

### *Замест фельетона*

***

- Самае карыснае ў «Чупа-чупс» - гэта палачка. У ёй меньш за ўсё фарбавальнікаў.

***

- «Не трэба змагацца за чысціню; трэба месці.» Ілля Ільф.

***

- У заапарк зайшоў святар і ўбачыў каля адной з клетак групу сумных людзей.
- У вас што-небудзь здарылася? - з клопатам у голасе спытаў ён.
- Слон памёр.
- Вельмі добра, што я бачу вашу жалобу па жывёле - гэтай божай істоце.
- Ды не ў гэтым справа! Проста нам трэба для яго яму выкапаць!

***

- У цырку два самых паслухмяных мядзведзя памерлі ад цукровага дыябету.

## Стабільны рэйтынг біяфака

**Колькасць абітурыентаў, што жадаюць навучацца на факультэце біялогіі і экалогіі ГрДзУ, склала 145 чалавек па дадзеных на 11 гадзін 29 ліпеня.**

У суботу – 29 – быў апошні дзень працы прыёмнай камісіі. На спецыяльнасць біялогія да раніцы гэтага дня свае заявы падалі 83 чалавекі, на спецыяльнасць біяэкалогія – 63. Конкурс саставіў 3,3 чалавекі на месца біёлага і 6,2 – на месца эколага. У гэтым годзе на факультэт плануецца прыняць на вочную бюджэтную форму навучання 25 біёлагаў і 10 біяэколагаў. Акрамя таго, для тых, хто не набраў дастатковую колькасць балаў, запланавана яшчэ 15 і 20 месцаў адпаведна для навучання на платнай аснове.

Адна з абітурыентак кажа: "Я вырашыла паступаць на гэты факультэт, таму што люблю прыроду і хацела б займацца яе аховай. Вельмі спадзяюся, што ў мяне ўсё атрымаецца."

Як кажа намеснік дэкана па выхаваўчай працы Кацярына Бялова, такая колькасць абітурыентаў звычайная для факультэта біялогіі і экалогіі. У мінулым годзе жадаючых было




Хутка універсітэт папоўніцца новымі студэнтамі

крыху больш, але ўсярэднім рэйтынг не вельмі змяніўся за апошнія некалькі год.

Для таго, каб падаць сваю заяву на гэты факультэт кожнаму абітурыенту давялося прайсці тры тэставанні: па хіміі, біялогіі і адной з моваў (беларускай ці рускай). Усе яны праходзілі ў чэрвені, таму маладыя людзі ўжо даўно ведаюць свае балы.

Залічэнне на ўсе факультэты, у тым ліку і факультэт біялогіі і экалогіі, пройдзе 6 жніўня. У гэты дзень стане вядома, колькі першакурснікаў папоўняць шэрагі студэнтаў.

**В.С.**

# Асновы настаўніцтва

**Мы пачынаем весці новую старонку, дзе будзем змяшчаць карысную і цікавую інфармацыю для маладых настаўнікаў хіміі і біялогіі. Таксама вы зможаце задаць пытанне, што найбольш вас цікавіць, нашаму спецыялісту (адрасы, па якіх можна заранёў даслаць пытанне ў рэдакцыю, шукайце на апошняй старонцы).**

Існуюць агульна-карысныя правілы, без якіх немагчымая паспяховая дзейнасць любога настаўніка – не толькі маладога.

## Памятка маладому настаўніку пры падрыхтоўцы да ўрока

1. Вызначце навучальна-выхаваўчыя задачы цэлай тэмы.

2. Прадумайце, якія з іх будуць вырашацца на дадзеным уроку, што галоўнае ў матэрыяле ўрока.

3. Вывучыце метадычныя дапаможнікі па правядзенню ўрока.

4. Сур'ёзна прадумайце метадычныя задачы падручніка і магчымае спалучэнне тэмы з задачамі ўрока.

5. Вырашыце, якія ўменні і навыкі будзеце адпрацоўваць на дадзеным уроку.

6. Ці ўсё са старога матэрыялу адпрацавана Вамі для глыбейшага вывучэння і засваення новага.

7. У плане выразна адлюструйце метады, прыёмы, сродкі навучання, кампазіцыю ўрока - гэта будзе Вашай творчасцю.

8. Не забудзьцеся аб міжпрадметных сувязях, аб асноўных ведах, якія з'яўляюцца стрыжнявымі ў дадзеным курсе.

9. Няхай арыенцірам для Вас служыць абавязковы мінімум праграмы адукацыі па прадмеце.

10. Паказчыкам падрыхтаванасці да ўрока служыць выкананне вучнем хатняга задання.

11. Падыходзьце да кожнага вучня індывідуальна, без гэтага не дамагчыся глыбокіх і моцных ведаў.

12. Прадумайце заўтрашнія заняткі так, каб яны былі звязаныя з усёй сістэмай вывучэння той або іншай тэмы.

## Асаблівасці самаарганізацыі настаўніка

1. Падрыхтаванасць да ўрока і галоўнае – усведамленне псіхалагічнай мэты, унутранай гатоўнасці да яе ажыццяўлення.

2. Працоўнае самаадчуванне ў пачатку і на працягу ўрока (сабранасць, сунастроенасць з тэмай і псіхалагічнай мэтай урока, энергічнасць, настойлівасць у ажыццяўленні пастаўленай мэты, аптымістычны падыход да ўсяго, што адбываецца на ўроку, педагагічная кемлівасць і інш.).

3. Педагагічны такт.

4. Псіхалагічны клімат на ўроку (падтрыманне атмасферы радасных, шчырых зносінаў, дзелавы кантакт і інш.).

## Гігіенічныя патрабаванні да ўрока

1. Тэмпературны рэжым.

2. Фізіка-хімічныя ўласцівасці паветра (патрэбнасць праветрывання).

3. Асвятленне.

4. Папярэджанне стомы і ператамлення.

5. Чаргаванне спосабаў дзейнасці (змена слухання выкананнем вылічальных, графічных і практычных прац).

6. Своечасовае і якаснае правядзенне "хвілінак фізкультуры".

7. Падтрыманне правільнай працоўнай паставы навучэнца.

8. Адпаведнасць класнай мэблі росту школьніка.

## Метадычныя рэкамендацыі маладому спецыялісту

1. Уважліва сачыце за навукова-метадычнай літаратурай, вядзіце бібліяграфію літаратуры па пытанню, якое Вас цікавіць.

2. Захоўвайце і назапашвайце матэрыялы, якія адлюстроўваюць дослед Вашай працы: планы, канспекты, дыдактычныя дапаможнікі, тэмы сачыненняў навучэнцаў, іх пытанні, адказы, свае назіранні за духоўным развіццём школьнікаў. Адзначайце пры гэтым Вашыя сумневы, няўдачы.

3. Матэрыял імкніцеся выкладаць каротка, проста, лагічна, стройна, пазбягаючы паўтораў.

4. Працуючы над тэмай, райцеся з калектывам, са сваімі калегамі, распавядайце ім аб сваіх цяжкасцях, сумневах. Так могуць з'явіцца каштоўныя думкі, патрэбныя факты.

5. Падбярыце і патрэбным чынам афарміце дадаткі (схемы, карты, табліцы, працы навучэнцаў, спісы літаратуры і г.д.).

**В.С.**

**Як маладому настаўніку паводзіць сябе пры першай сустрэчы з вучнямі, каб заваяваць іхні давер і павагу?**

***Адказвае Алесь Белакоз:***

«Неабходна быць добразычлівым, але не дапускаць празмернага панібрацтва. Старацца пазбягаць словаў-паразітаў - гэта не ўпрыгожвае настаўніка.

Каб усталяваць цішыню і дабіцца ўвагі, не трэба звяртацца да ўсяго класа адразу. Гэта не дасць плёну. Лепш падыміце аднаго канкрэтнага вучня - астатнім не захочацца такой пільнасці ў адносінах да сябе.

А галоўнае - гэта зацікавіць вучняў, даць ім зразумець важнасць вывучэння прадмета.»



# Гараднічанка: сучасны стан хроснай маці Горадні

**Гараднічанка – рака, што мкне сваю плынь проста ў межах старажытнай Горадні. Не кожны горад можа пахваліцца такім багаццем. Чаму ж сярод гараджан замест прыгожай назвы ракі распаўсюджана зневажальная – “Ванючка"? У гэтым ёсць немалая правіна і саміх жыхароў горада.**

## Каналізацыя...

Акрамя таго, што ў раку выпускаюцца стокі дажджавой каналізацыі, якая складаецца з калектараў рознага часу пабудовы і адпаведна рознай ступені прыгоднасці, сюды ж несанкцыянавана сцякае ўсё, што копіцца ў прыбіральнях неадказных жыхароў прыбярэжнай зоны Гараднічанкі. У цэнтры горада ёсць яшчэ і старая агульнасплаўная, гэта значыць бытавая і дажджавая, каналізацыя, трубаправоды якой злучаны між сабою. У перыяд вельмі інтэнсіўных ападкаў з-за свайго малога дыяметру (калі пабудаваныя ж былі!) дажджавыя трубы перапаўняюцца, іх змесціва змешваецца з усім, што знаходзіцца ў суседніх “артэрыях”, і забруджвае “водныя аб’екты”, у асноўным, шматпакутную Гараднічанку.

## Чаго няма ў табе, вадзіца?

Камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы прыроды Горадні ў 2002 – 2003 гг. быў праведзены спецыяльны аналіз і былі выяўлены ўмовы, што садзейнічаюць забруджванню Гараднічанкі.

Па дадзеных справаздачы, рака належыць да двух ландшафтна-планіровачных раёнаў: II і VII.

ЛПР-II – “Цэнтр”, у найбольшай ступені забруджваецца паветранымі плынямі цэнтра горада і паўночнага прамысловага раёна. Тут 45 % тэрыторыі даліны Гараднічанкі з’яўляюцца зонай асаджэння забруджваючых рэчываў.

ЛПР-VII – “Падкрыжакі”, таксама забруджваецца ў выніку ўздзеяння горада і прамысловай дзейнасці “Азоту”.

Па выніках экспертызы было выяўлена, што ў Гараднічанцы стрыманне шмат якіх рэчываў пераўзыходзіць дапушчальную колькасць. Так, нітрытнага азоту больш у 25 разоў; жалеза – у 5; нафтапрадуктаў – у 10 разоў.

## “Рэканструкцыя”

Горадню рэканструіруюць: дзе можна і дзе няможна. Не прайшлі і паўз Гараднічанку. “Рэканструкцыя русла Гараднічанкі, аднаўленне “Швейцарскай даліны”, - гэтак называецца праект Міністэрства спорту і турызму , што ўваходзіць у межы не так даўно прынятай нацыянальнай праграмы развіцця турызму РБ на 2006-2010 гады.



Гараднічанка мае каля 40 такіх «прытокаў»

Выканаўчай арганізацыяй з’яўляецца Гарадзенскі аблвыканкам, крыніцай фінансавання – абласны бюджэт. Запланаваныя выдаткі – 100 млн. руб. Большы кавалак працы ўжо зроблены, скончыць рэканструкцыю берагоў ракі мяркуецца ў гэтым годзе. Вынікам працы павінна быць “аднаўленне прыроднага аб’екта”.

Але ці надоўга? Сярод гарадзенцаў ходзяць упартыя чуткі аб тым, што значную частку русла Гараднічанкі возьмуць у калектар, бо на ёй плануецца будаўніцтва новай шасціпалоснай магістралі. Па словах гарадзенскага архітэктара Аляксандра Штэна, праект будаўніцтва магістралі абавязкова здзейсніца, бо ён прадугледжаны ў генеральным плане горада, зацверджаным прэзідэнтам РБ. Але ў якім выглядзе, пакуль невядома – розным яго варыянтам ужо больш за 30-40 год. А. Штэн кажа, што больш за 3 паласы пабудаваць будзе немагчыма, але іх будзе дастаткова. Ён тлумачыць будаўніцтва дарогі ў гістарычным цэнтры, а не на ўскраіне горада, немэтазгоднасцю радыюса магістралі большага за тры кіламетры. “Калі ўвесь цэнтр зрабіць пешаходным – гэта будзе мёртвою зонаю, бо людзям будзе складана туды дабрацца без транспартнага руху”, – кажа архітэктар.

## Як бараніць

Камітэт прыродных рэсурсаў бачыць наступныя шляхі паляпшэння экалагічнага стану Гараднічанкі:

- стабілізацыя антрапагенных уздзеянняў;
- арганізацыя інжынерных мерапрыемстваў па ачыстцы стокаў;
- стварэнне ахоўнага і захаванне існуючага азелянення ў даліне ракі.

Выкладчыкі і студэнты факультэта біялогіі і экалогіі ГрДзУ вырашылі весці самастойны манітора стану ракі. Ён будзе насіць доўгатэрміновы (на працягу некалькіх год) і комплексны характар: будзе вывучацца флора, фаўна, мікрабіялагічны склад вады, глеба і донныя адкладанні.

Концентрация загрязняющих веществ в местах отбора проб
(в знаменателе – предельно допустимые концентрации)
за период с 01.01.2002 по 25.04.2003

| Места отбора проб | БПК5 | Нефтепродукты | Хлориды | Азот аммонийный | Азот нитратный |
|---|---|---|---|---|---|
| р. Городничанка до зоопарка | 3,4<br>2,25 | 0,02<br>0,05 | 23<br>300 | 0,5<br>0,39 | 2,5<br>9,1 |
| р. Городничанка во дворе магаз. "Спутник" | 6,8 | 0,03 | 22 | 0,2 | 2 |
| р. Городничанка по ул. Ленина | 5,5 | 0,04 | 20 | 4 | 3,8 |
| устье р. Городничанка | 6,4 | 0,02 | 25 | 1,1 | н.о. |
| приток р. Городничанка по ул. Мицкевича | 4,1 | 0,03 | 20 | 2,3 | 3,1 |
| устье по ул. Виленская | 6,1 | 0,05 | 19 | 1,4 | н.о. |

Што ж да захавання Гараднічанкі, як гістарычнай каштоўнасці, навукоўцы і грамадскія актывісты Горадні, па словах гарадзенскага краязнаўцы Ігара Лапехі, падрыхтавалі альтэрнатыўныя прапановы пабудовы магістралі, што дазволіць захаваць гісторыка-культурную спадчыну горада. Ён лічыць, што рух аўтатранспарту трэба выносіць на ўскраіну.

«Але гэтыя прапановы ігнаруюцца гарадскімі ўладамі. Так, мы размясцілі нашы прапановы на сваіх інтэрнэт-сайтах **(www.grodnoproblem.km.ru і www.harodnia.com)**, адрасы якіх добра вядомыя ўладам, і не дачакаліся ад іх ніякага адказа», - сказаў краязнаўца.

У такіх варунках падаецца, што было б вельмі карысна, каб і ўсе жыхары Горадні не заставаліся абыякавымі да лёсу ракі. Толькі грамадою, патрабуючы ад уладаў прыняцця ва ўвагу меркаванняў спецыялістаў і простых гараджан, мы зможам захаваць унікальны гісторыка-прыродны аб'ект. І толькі разумеючы і шануючы ўсю яго каштоўнасць мы зможам забыцца на непрыемную назву і ганарыцца тым, што наш горад мае ГАРАДНІЧАНКУ.

**В.С., В.В.**


Горадня, 1766 г. Тызенгауз


Горадня, 2006 г...

# Трохі гісторыі

Пры ўпадзенні ракі Гараднічанкі ў Нёман, на ўзгорку вышынёй больш за 32 м у канцы XI ст. быў пабудаваны дзядзінец, што стаў першаасновай Горадні. Пазней побач з замкам на ўчастку плато паміж дзвюма рэкамі сфармавалася гандлёвая плошча.

У 1760-1780-ых гг. па ініцыятыве міністра фінансаў А.Тызенгаўза на паўночнай ускраіне горада, на месцы вёскі Гарадніцы, ствараецца прамыслова-культурны цэнтр, што з'явілася буйнейшым горадабудаўнічым мерапрыемствам. Ландшафт раёна ўзбагачаўся сажалкамі на рацэ Гараднічанцы.

Яшчэ на пачатку XX стагоддзя Гараднічанка была даволі паўнаводнаю ракою, па якой маглі праплыць лодкі і плыты. Сіла плыні была такой, што ад яе працаваў млын. Гэта была чыстая рака – з яе бралі воду не толькі для гаспадарчых патрэбаў, але і для піцця. Зафіксаваны наступны факт: у 1905 годзе купец Бацюшкаў быў аштрафаваны на 50 грошаў за тое, што зліў нейкія адходы ў прыток Гараднічанкі – Юрысдыку.

**В.С.**

# Большасць гарадзенцаў не згодная з уладамі

Мы вырашылі высветліць, што ведаюць і думаюць аб лёсе Гараднічанкі жыхары горада. Было апытана 30 чалавек.

На пытанне “Ці ведаеце вы аб тым, што ў гістарычным цэнтры горада запланавана пабудова магістралі”, 77% рэспандэнтаў адказалі адмоўна і толькі 23% нешта чулі аб гэтым. Аб тым, што Гараднічанку нельга закоўваць у падземны калектар, заявілі 90%. Самым распаўсюджаным тлумачэннем нязгоды быў аргумент аб тым, што Гараднічанка мае каштоўнасць, як прыродны аб'-ект. Некаторыя таксама разумеюць, што неабходна захоўваць сваю гісторыю. Маладая жанчына, што жыве непадалёк ад Гараднічанкі, сказала: “Мне падабаецца, калі горад абнаўляецца. Але трэба шукаць нейкія альтэрнатыўныя варыянты, бо тое, што напланавалі нашы архітэктары, не паддаецца апісанню. А з Савецкай зусім палігон зрабілі.”

Толькі трое з 30 жыхароў Горадні мяркуюць, што рэчку можна схаваць у трубу. Аднаму маладому чалавеку было б утульна ездзіць па новай дарозе, бо яму ў Горадні цеснавата; ён не бачыць праблемы ў тым, што магістраль пройдзе па гістарычным цэнтры. А студэнт лічыць, што Гараднічанка – не такая ўжо і вялікая выдатнасць, каб аб ёй хвалявацца.




*Каментар спецыяліста*

Мінскі краявед Раман Абрамчук паведаміў у інтэрв'ю БелаПАН 21 чэрвеня аб занепакоенасці прадстаўнікоў грамадзскасці планамі ўлад Горадні па будаўніцтву шматпалоснай магістралі праз гістарычны цэнтр горада.

“Магістраль плануюць правесці па лініі ракі Гараднічанкі, па месцы, дзе быў заснаваны горад Гродна. Археалагічных раскопак, насуперак заканадаўству, на гістарычных месцах праводзіць не плануюць. Рака Гараднічанка, якая ўпадае ў Нёман і стварае непаўторнае аблічча гістарычнай забудовы, будзе ўзята ў калектарную трубу, як некалі Няміга ў Мінску. Такім чынам, будзе разбураны ўнікальны гістарычны ландшафт”, - кажа навуковец.

**Паводле http://naviny.by**

## Аб чым шэпчуцца ракі

*Гелена Белязюн*



**У вяскоўцаў існуе павер'е: калі ракаў налапаць у кош, то яны паміж сабою шэпчуцца. Шэпчуцца, шэпчуцца, а аб чым – не зразумееш. Адныя бабулі і дзядулі ведаюць, што гэта яны перад смерцю адзін з адным развітваюцца.**

Раней ракаў у рэчках было больш, чым рыбы. Вяскоўцы вечарамі прыходзілі да сваіх беражкоў, а з сабой неслі раччыныя сачкі: загінаецца івавы пруток колцам, яно абцягваецца сеткай, на сетку кладзецца кавалачак смажаннай жабы, пах якой выманьвае ракаў з падводных схованак.

Пасля заходу сонца, узрадаваныя сваёй здабычай, людзі вярталіся дамоў. І толькі адно не суцяшала: не



Не кожны чуе, як шэпчуцца ракі

паперашэптваліся б ракі.

А яны не паміраць збіраліся, а жыць хацелі. Кожны рак усе свае ножкі пускаў у справу, каб дзе-небудзь знайсці дзірачку, праз якую мог пралезці самы вялікі рак, а за ім астатнія – меншыя. З каша – на бабуліну кацавейку, з кацавейкі – на спадніцу, са спадніцы – на сцяжынку, са сцяжынкі – на траву, а з травы ўжо блізка і да роднай рэчкі.

І толькі прыйшоўшы дамоў ды зняўшы з плеч кош, вяскоўцы разумеюць, што ракі развіталіся не адзін з адным перад смерцю, а з імі перад уцёкамі.

*Пад пагрозай*

**Мы вырашылі стварыць рубрыку "Пад пагорозай", дзе будзем асвятляць праблемы некаторых прыродных аб'ектаў, якія, на наш погляд, маюць вялікае значэнне для Гарадзеншчыны.**



Гэтак вывозіцца Пушча

## Белавежская пушча

Пушча – адзін з сімвалаў Беларусі. Чым яна жыве сёння, якія мае праблемы? Не ўсё так добра, як можа здацца неабазнанаму чалавеку. Вось некаторыя меркаванні неабыякавых спецыялістаў.

Навуковец, аўтар газеты «Белавежская пушча» Уладзімер Дацкевіч: «Я скажу вам самыя горкія, самыя крыўдныя, можа, самыя балючыя словы, якія мушу сказаць. Старажытная пушча засталася ў мінулым. Той лес, які мы нядаўна паважалі за пракаветна-казачны, велічны, першародны, сёння ўжо страчаны. Паўвеку я прахадзіў тут і сёння магу даказаць любой камісіі, што ўсё тут затурзана і спаганена. А што робяць тыя, хто тут камандуе? Нялягаюць на гасцініцы, рэстараны, тэнісныя корты. Ды ёлкі-палкі! Хто сюды паедзе? Усё ж непамерна дорага. А што для выхавання, для дапытлівых дзіцячых душ? Дзе культура, этыка, веды, любоў да прыроды? Дзе намаганні па захаванні пушчы як аб'екта нумар адзін нашай прыроднай спадчыны, як унікума Еўропы? Я вельмі шкадую, але павінен сказаць: у Белавежскай пушчы ўжо няма чаго паказваць турысту».

**Юрыдычная даведка**

**У Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь гаворыцца: "Ахова прыроднага асяроддзя – абавязак кожнага". У горадзе Охрусе (Данія) 23-25 чэрвеня 1998 года прынятая Канвенцыя аб доступе да інфармацыі, удзелу грамадзкасці ў працэсе прымання рашэнняў і доступе да правасуддзя па пытаннях, датычных навакольнага асяроддзя. Охруская Канвенцыя зацверджана ўказам прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь 14 снежня 1999 года № 726.**

Удзельнікі кампаніі «Спынім знішчэнне запаведных тэрыторыяў» прыводзяць наступныя звесткі: «Амаль цалкам спыненыя навуковыя даследванні, затое паўсюль пабудаваныя сучасныя лесапілкі, гатэльныя комплексы для аматараў «элітнага палявання».

## Аўгустоўскі канал

Яшчэ адным аб'ектам, за лёсам якога мы плануем сачыць, – гэта Аўгустоўскі канал. Толькі што скончыліся працы па яго рэканструкцыі, тут плануецца "развіваць турызм".

Вось што піша журналіст Алесь Кавалёў у другім травеньскім нумары бюлетэню "Прынямонне": «Паводле эколагаў і гісторыкаў, з запаведным прыродным кутком, па якім праходзіць Аўгустоўскі канал, абышліся амаль па-варварску – пляжылі дрэвы, старыя камяні шлюзаў замянялі бетоннымі блокамі, разагналі птаства, нявечылі ландшафт цяжкай тэхнікай».

## Гараднічанка

Таксама мы працягнем асвятленне праблем ракі Гараднічанкі, якое пачалі ў гэтым нумары.

**В.В.**



Адноўлены Аўгустоўскі канал

# “Вада-вадзіца, Божая памачніца”

*Вольга Сташко*



**Сёння, калі вада даступная кожнаму – толькі адкруці кран, яе не шануюць. Нашыя ж продкі ўмелі бачыць таямнічае ў звычайным і надавалі вадзе вялікі жыццестваральны сэнс.**

## Вада ў жыцці чалавека

У адпаведнасці са старажытнымі міфалагічнымі ўяўленнямі славян, вада – адна з асноўных стыхій, якая прымала ўдзел у стварэнні Сусвету і дала пачатак усяму жывому на Зямлі.

Для нашых продкаў вада грала важную ролю ў самых ключавых момантах жыцця (першае купанне немаўляя; вядром з вадой перагароджвалі дарогу вясельнай працэсіі; абмыванне нябожчыка і г.д.). Таму зразумела, што ёй пакланяліся яшчэ з паганскіх часоў. У больш позні хрысціянскі перыяд у гадавым колазвароце з’явіліся святочныя дні, у якія пажадана асвячоную ў храме ваду браць дадому: на Раство Хрыстова, Вадохрышча, Стрэчанне, у Чысты чацвер, на Вялікдзень і Йвана Купалу.

## Гаючая вада

Цікава, што ў народнай магіі рэчаў, пры дапамозе якіх можна нашкодзіць чалавеку і яго гаспадарцы, безліч, а вось дапамагчы здольна толькі вада. Гаючай лічылася не толькі тая вада, якую “загаварыў” знахар, але і :

- тая, якую бралі з крыніцы або студні на ўзыходзе сонца;
- набраная з трох, сямі ці нават дзевяці рэчак або калодежаў;
- у якой варыліся велікодныя яйкі;
- якой мылі хлебную дзяжу, абразы;
- якую пралілі праз рэшата, адтуліну ад сучка ў смаліне або праз дзвярную завесу;
- у якую апускалі лекавыя расліны, святаянскія (сабраныя на Купалле) зёлкі, вугальчыкі са сваёй печы, медныя, срэбныя ці залатыя манеты.



Хрышчэнская вада ачышчае душу і цела

## “Вадзяныя” павер’і

Вада ў міфалогіі з’яўляецца мяжой паміж гэтым і “тым” светам. Такое бачанне нарадзіла шмат перасцярог і забаронаў.

Трэба абавязкова закрываць нанач калодзежы і посуд з вадой, іначай у ёй будуць купацца чэрці.

У вадзе жывуць душы заўчасна загінуўшых дзяцей і дзяўчат (русалкі), а ў балотнай – нячыстая сіла. Таму калі заходзіш у ваду (у любым выпадку), трэба сказаць : “Я ў ваду, нячысцік – з вады; я з вады, нячысцік – у ваду!”

Цяжарнай жанчыне нельга адліваць ваду з вядра ў калодзеж, каб дзіця не было слюнявым.

Калі ўпершыню мылі дзіця, у ваду, акрамя святаянскіх зёлак, кідалі галінку чартапалоху, “каб не баялася” і дубовую кару, “каб зубкі былі моцныя”.

Вада – крыніца жыцця, дадзеная прыродаю. Нам трэба навучыцца берагчы тое, што ў нас ёсць, пакуль мы не страцілі апошняе.

## Беларускае вяселле: Сустраканне маладых

Маладых сустракалі ў варотах пры ўваходзе ў двор. Папярэдне бацькі выносілі стол, слалі абрус, ставілі бутэльку гарэлкі і дзве чаркі, маці трымала на зведзеных разам чырвоных канцах рушніка хлеб-соль. Увогуле, усе паверхні на вяселлі мусяць быць засланымі, таму сёння ў ЗАГС, акрамя таго рушніка, на якім будуць стаяць маладыя, трэба ўзяць і яшчэ адзін – для стала, на якім яны будуць распісвацца.

Са з’ўленнем вясельнай дружыны бацька і маці апраналі на сябе вывернутыя поўсцю наверх кажухі, бралі ў рукі грамнічную свечку і ішлі сустракаць маладых. Тыя, сышоўшы на дыван, а не на голую зямлю, і параўняўшыся з бацькамі, кланяліся і прымалі ад іх віншаванні з заключэннем шлюбу. Маці тройчы падносіла спачатку дачцэ, а потым зяцю бохан хлеба (каравай). Зараз існуе недарэчны звычай адкусваць хлеб: хто больш ухопіць, той будзе гаспадаром у сям’і, іншыя адломваюць кавалкі. Каравай у беларусаў – рытуальнае печыва. Ламалі яго толькі на пахаванні. А на вяселлі маладым трэба тройчы пацалаваць паднесены хлеб. Бацька наліваў у чаркі маладым гарэлку, якую яны, толькі прыгубіўшы, за першым разам вылівалі праз левае плячо за сябе. За другім разам усё паўтаралася. Трэці раз маладыя злёгку прыгублялі пітво і, ужо не выліваючы, кідалі кілішкі праз левае плячо: уцалеюць ці рассыплюцца – гэта ўжо справа лёсу.

*Працяг у наступным нумары*

# АБ'ЯВЫ

Аб'яднанне "Гісторыка" плануе летнік. Ён адбудзецца ***15 – 27 жніўня ў Любчы*** пад патранажам кіраўніка Фонду "Любчанскі замак" Івана Пячанскага. Мяркуецца пабудаваць паўтараметровы мур паміж дзвюма адноуленымі вежамі. Маецца зацверджаны праект і будматэрыялы, патрэбныя толькі рукі. Па інфармацыю звяртацца па тэлефонах: **755-03-70 і 654-65-59 (Зміцер).**



**Стары замак Гародні чакае сваёй рэканструкцыі**

***26 – 27 жніўня ў Лідзе*** – штогадовы фэстываль "Замак Гедыміна". Удзел прымаюць рыцарскія клубы з Беларусі, Польшчы, Літвы і Расіі.

## Слушнае апраўданне

Пакупнік - да новай прадаўшчыцы:

- Вы кошт тавару мне завысілі ўдвая, -

Рабіць так за прылаўкам не гадзіцца!..

- Шаноўны, а пры чым тут я?..

- Вы лічыце, што двойчы пяць будзе роўна дваццаць пяць?

- Хіба ж у тым я вінавата, што сапсаваўся калькулятар?

- Дык вы ж табліцу множання вучылі ў школе!..

- Я да яе не дакраналася ніколі: яна ўжо выйшла з школьнага ўжытку, нават не друкуецца ў вучнёўскіх сшытках!

**Pro Nobis жадае ўсім весела правесці апошні месяц лета!**

# Інтэрнэт



***www.nastaunik.info/***

Супрацоўнікі Альтыора - Студыі EGO распрацавалі сайт для грамадскай ініцыятывы «Інфармацыйна-метадычны цэнтр для настаўнікаў».

На сайце можна будзе атрымаць інфармацыю аб усялякіх праграмах, конкурсах, канферэнцыях, якія праводзяцца ў Беларусі, а таксама ўсталяваць кантакт з патрэбным спецыялістам: метадыстам, юрыстам, трэнерам або проста калегам, які выкладае той жа прадмет.

У інтэрнэт-бібліятэцы партала можна будзе атрымаць унікальныя матэрыялы, навучальныя праграмы, відэафільмы, многія з якіх у Беларусі існуюць у адзінкавых экзэмплярах.

**Цікавая дэталь**

Чым больш старонак сайта вы праглядзіце, тым менш крэйды застанецца для выкладчыкаў.

## Гісторыя адной качкі

**На дзень горада...**





першая экалагічная газета Pro Nobis
распаўсюджваецца бясплатна №4(8) ЛЕТА 2006

Галоўны рэдактар: **Віктар Валько**
**тэл. (маб.): 781 20 98**
Вёрстка: **Дзмітрый Гупянец**
Аб'ём: 1 умоўна друкаваны аркуш
Наклад 299 асобнікаў

Выдавец: Гродзенскі моладзевы рэдакцыйны цэнтр
Надрукаваны на абсталяванні выдаўца
Адрас рэдакцыі: г. Гродна вул. Будзёнага, 48а
Нумар падпісаны ў друк: 27.07.2006

Вашыя артыкулы і пытанні вы можаце дасылаць на E-mail:
**pronobis2004@mail.ru**
і па адрасе
230010 г. Гродна пр. Я. Купалы 72/1, кв.20